**Т.І. Борбат**
***(Магілёў)***

# “НЕ ГОІЦЦА ДАЎНЯЯ РАНА...” (Памяць пра Вялікую Айчынную вайну ў паэзіі С.І.Грахоўскага)

У апошнія дзесяцігоддзі значна ўзрасла цікавасць да памяці як катэгорыі не толькі гістарычнай, псіхалагічнай, але і эстэтычнай. “Памяць – аснова сумлення і маралі, і – аснова культуры, “накапленняў” культуры, памяць – адна з асноў паэзіі – эстэтычнага разумення культурных каштоўнасцей, – пісаў акадэмік Д.С.Ліхачоў [3, 203].

У сучаснай літаратуры паняцце памяці цесна звязана з пачуццём гісторыі. Цікавасць да мінулага становіцца прыметай грамадскага і мастацкага асэнсавання часу. Усё часцей у шматлікіх мастацкіх творах гучыць пытанне: што дае гісторыя не толькі для агульнага прагрэсу, але і для асобы, як выяўляюцца ў яе развіцці дабро і зло ?

Тэма памяці з’яўляецца адной з цэнтральных тэм творчасці С.Грахоўскага і ўвасабляецца перш за ўсё ў творах пра Вялікую Айчынную вайну. Вершаў на гэту тэму ў творчай спадчыне мастака няшмат, аднак голас паэта гучыць гучна і пранікнёна (“Хвіліна маўчання”, “Званы”, “Вечны салдат”, “Ноч на плошчы перамогі”, “Маці правафлангавага”, “Ваенныя фільмы”, “Страта”, “Боль”). Усе творы на ваенную тэму вызначаюцца публіцыстычнай вастрынёй, драматычнай напружанасцю, лірычнай шчырасцю.

С.І.Грахоўскаму не давялося абараняць Радзіму са зброяй у руках і таму “ваяваў” паэт ў лагеры – “рыхтаваў ружэйнаю балванку, авіяфанеру, шпалы” [4, 4 ].

Мастак слова шукае новыя вершаваныя формы для таго, каб паказаць недарэчнасць і жорсткасць вайны. Ён пазбягае адлюстравання крывавых сцэн, жахаў баёў. Вайна паўстае як бы апасродкавана: праз пакалечаныя лёсы, не заўсёды бачныя душэўныя раны. Паэт засяроджвае ўвагу на сацыяльна-маральных уроках вайны, гістарычным значэнні подзвігу народа.

Разбуральная сіла вайны паказана ў вершы “Вечны салдат”. Погляд на вайну праз перажытыя гады становіцца філасофскім, характэрна імкненне аўтара асэнсаваць ваенныя падзеі ў святле вечнага і часовага:”Хоць маці не верыць, а часам чакае,// Напэўна, ўжо матчына доля такая:// Сыноў гадаваць, выпраўляць у дарогу…”[1, 101]. Тэма нараджае новыя паэтычныя прыёмы, стылёвыя рысы



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

(змешвання часоў, прысутнасць умоўнага і рэальнага, наяўнасць сноў). У большасці твораў, аб'яднаных тэмай памяці пра вайну, гучаць элегічныя матывы. Сум — гэта тое пачуццё, якім напоўнены кожны вышэй пералічаны твор, ён як бы раствораны ў паэтычных радках. Сумам і болем трагічнай страты напоўнены верш "Ваенныя фільмы". Паэт стварае асобы лірычны настрой перш за ўсё дзякуючы інтанацыі, у якой цесна пераплецены чаканне і надзея:"Жанчына гаворыць з сабою// І ўсё перачытае зноў// Прапахлыя порахам бою// Пажоўклыя пісьмы сыноў" [1, 114].

Твор глыбока драматычны. Аднак знешні драматызм носіць стрыманы характар. Усё гэта сведчыць пра тое, што паэт выбраў правільны шлях у сваім імкненні данесці да чытача ўвесь боль перажытага. За стылёвай стрыманасцю паэта стаіць такая глыбіня гора, якое цяжка выказаць словамі:"Вось гэтак адна і звякуе// Без ласкі, лістоў і абноў// А радасць адна, што святкуе// Усе дні нараджэння сыноў"[1, 115]. Унутранае напружанне, сапраўднасць пачуццяў – вось што тоіцца за знешне, здавалася б, павольнымі, роўнымі радкамі.

Цікавасць уяўляюць сабой пейзажы ў творах С.Грахоўскага на ваенную тэму. Усе яны захоўваюць гістарычную памяць. Кожная дэталь нясе на сабе адбітак часу: "бэз буяў", "сівыя адцвіталі палыны", "пачарнелы за ракою стог", "снег лажыцца на пагоны" і г. д.

Памяць пра вайну выяўляецца пры апісанні прыроды перш за ўсё праз асацыяцыі: "яны ляцелі жураўліным клінам// Насустрач перамозе і агню[ 1, 107], "Гарэць апёкі і рубцы на скронях,// Здаецца кроў сцякае на траву"[ 1, 122].

Боль ваеннай памяці прарываецца часам у кантраснай колернай гаме, якая на агульным фоне мяккіх тонаў С.Грахоўскага гучыць нечакана, аднак псіхалагічна матывавана выбарам тропа: напрыклад, параўнання і метафары: "Стаіць без каскі// Бронзавы салдат,// Як вартавы,// Над брацкаю магілай,// Яго дажджы сякуць// І хвошча град" [1, 101].

Пры вырашэнні паэтычнай тэмы памяці роля параўнання неадназначная: па-першае, яно указвае на два часовыя пласты, якія ў сваім вершы аб'ядноўвае паэт [1, 116]; па-другое, дзякуючы гэтаму фарміруецца наша ўяўленне пра лірычнага героя [1, 107,116]; па-трэцяе, параўнанне прымае ўдзел не толькі ў стварэнні антыноміі, супрацьпастаўленні дэталей, вобразаў, а і выконвае ролю кандэнсаванага фактару, які ў малым аб'ёме перадае змест [1, 101,121].

Часам паэт выкарыстоўвае не толькі тэкстуальна аформленае параўнанне, але і параўнанне скрытае "Боль", "Страта", "Грузчык сорак першага года".

Памяць пра вайну з'яўляецца цэнтральнай тэмай і паэмы "Бяссмертнікі". У творы перакаўча намаляваны вобраз маці, якая ўсё чакае свайго сына з вайны. Несуцешнае гора жанчыны набывае абагульняючы характар, бо такіх, як яна, было нямала на знявечанай вайной зямлі. Тым самым вобраз Маці ў паэме — вобраз збіральны.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Адметнай асаблівасцю твора з'яўляецца спалучэнне ў ім сімвалічнага, умоўнага і рэалістычнага пачаткаў. Усё гэта ўзмацняе ўвесь трагізм вайны і незваротнасць страты.

Такім чынам, матыў памяці пра Вялікую Айчынную вайну становіцца галоўным у лірыцы паэта 70-х – 80-х гадоў. Памяць для мастака – гэта спроба знайсці сацыяльныя, маральныя каштоўнасці сённяшняга дня, спроба звязаць мінулае і сучаснае. Гэта праблема можа быць агучана як праблема ўзаемаадносін чалавека і часу. Памяць у паэта – гэта сіла, здольная супрацьстаяць разбуральнаму напору часу, гэта "пераадоленне часу, пераадоленне смерці" [3, 119].

***Літаратура :***


1. Грахоўскі С.І. Выбраныя творы ў 2 Т. Т. 1. Паэзія. – Мн, 1973.
2. Лихачёв Д.С. Земля родная. – М., 1983.
3. Лихачёв Д.С. Письма о добром и прекрасном. – Изд. 3. – М., 1989.
4. Пра час і пра сябе расказвае паэт С.Грахоўскі // Знамя юности – 1987- 5 ноября.


Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова